Хочется надеяться, что экологическое воспитание получит дальнейшее развитие, и будут исправлены недостатки учителей и учебных методик, которые играют немаловажную роль в воспитании младших школьников, ведь экологическая тема была и будет настолько актуальна и близка человечеству, пока оно само будет существовать. И пусть так будет всегда! Пусть через слово красота и доброта входят в детские сердца. Практика экологического воспитания детей убеждает в том, что творческое общение с природой – сильнейший метод всестороннего воспитания и развития в ребенке лучших человеческих качеств. Мы – педагоги, мы созидатели человеческой души. Мы в ответе за их судьбы!

**Список литературы**


1. Зайнуллина, Г. Ф. Экологическое воспитание детей дошкольного возраста / Г. Ф. Зайнуллина // Актуальные вопросы современной педагогики: мат-лы VIII Междунар. науч. конф. (г. Самара, март 2016 г.). – Самара : ООО «Издательство АСГАРД», 2016. – С. 62–64.
2. Алексеев, С. В. Идея целостности в системе экологического образования младших школьников / С. В. Алексеев, Л. В. Симонова // Начальная школа. – 1999. – № 1. – С. 19–22.
3. Яхшиева, М. Ш. Физическое и духовное развитие человека в работах Абу Али ибн Сины (Авиценны) / М. Ш. Яхшиева // Молодой ученый. – 2015. – № 8. – С. 1080–1083.
4. Бахтибенов, А. Ш. Экологическое воспитание младших школьников / А. Ш. Бахтибенов // Русский язык. – 1993. – № 6. – С. 4–5.
5. Жабборова, О. И. Экологические мировоззрения Ибн Сины / О. И. Жабборова, Х. П. Кенжаева // Международный журнал гуманитарных и естественных наук. – 2018. – №5. – С. 22–24.
6. Вершинин, Н. А. Воспитание у младших школьников любви к природе родного края, интереса к природоведческих занятиям / Н. А. Вершинин // Начальная школа. – 1998. – № 10. – С. 9–11.
7. Сухомлинский, В. А. Сердце отдаю детям / В. А. Сухомлинский // Избр. произв.: в 5 т. Т. 3. – Киев : Рад. шк., 1980. – С. 5–259.


---

# МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫЯ ПРЭЗЕНТАЦЫІ ЯК СРОДАК СТВАРЭННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ У МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ


*Яршова В.І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск*



Анатацыя. Разглядаецца праблема выкладання ў пачатковай школе гістарычнай прапедэўтыкі з пункту гледжання стварэння гістарычных уяўленняў у малодшых школьнікаў. Разглядаюцца тыпы гістарычных уяўленняў. Падаецца апісанне мультымедыйных прэзентацый як сродка стварэння гістарычных уяўленняў. Аналізуюцца мэты выкарыстання прэзентацыі на занятках по прадмету «Мая Радзіма – Беларусь», дыдактычныя магчымасці. Раскрываюцца дыдактычныя патрабаванні да стварэння мультымедыйных прэзентацый як сродка стварэння гістарычных уяўленняў.



*Ключавыя словы: мультымедыйная прэзентацыя, гістарычная прапедэўтыка, гістарычныя уяўленні, малодшыя школьнікі, нагляднасць.*


Пры вывучэнні гісторыі вялікая ўвага павінна надавацца стварэнню ў навучэнцаў гістарычных уяўленняў, на аснове якіх фарміруюцца гіста-

рычныя паняцці. Гістарычныя ўяўленні – гэта адлюстраванне ў свядомасці знешніх, найбольш выразных асаблівасцей фактаў, падзей, асоб і лакалізацыя іх у часе і прасторы. Адрозніваюць тры віды гістарычных уяўленняў: аб фактах мінулага (матэрыяльнае, сацыяльна-палітычнае, гісторыка-культурнае жыццё людзей і інш.); аб гістарычным часе (працягласць і паслядоўнасць падзей, з’яў); аб гістарычнай прасторы (прывязка падзей да дакладнага месца дзеяння). У сістэме гістарычных ведаў уяўленні выконваюць ролю апорных сігналаў, якія дазваляюць аднавіць гістарычны факт, даць яго характарыстыку [1, с. 54].

На этапе гістарычнай прапедэўтыкі ў пачатковай школе пры вывучэнні змястоўнага блока ведаў «Мая Радзіма – Беларусь» адбываецца азнаямленне дзяцей са складаным, супярэчлівым і цікавым светам гісторыі праз блізкія і зразумелыя ім рэчы, прадметы, традыцыі і помнікі сям’і, горада, вёскі, рэгіёна. Гістарычныя ўяўленні дзяцей сістэматызуюцца і абагульняюцца. У выніку перад вывучэннем курса ўсеагульнай гісторыі ў малодшых школьнікаў фарміруюцца першапачатковыя ўяўленні і элементарныя паняцці пра гістарычны шлях беларускага народа на аснове знаёмства з гістарычнымі асобамі і галоўнымі падзеямі айчыннай гісторыі [2, с. 131].

Выбар метадаў стварэння гістарычных уяўленняў патрабуе ўліку ўзроставых асаблівасцей развіцця асноўных псіхічных працэсаў у дзяцей малодшага школьнага ўзросту: успрымання, памяці, уяўлення, увагі, мыслення, мовы. У сувязі з тым, што ўяўленні выступаюць у якасці пачуццёва-наглядных вобразаў рэчаіснасці, эфектыўным сродкам стварэння гістарычных уяўленняў пры выкладанні гістарычнай прапедэўтыкі з’яўляецца нагляднасць [3, с. 234]. На основе непасрэднага ўспрымання прадметаў ці з дапамогай выяўленчай нагляднасці ў працэсе навучання ў малодшых школьнікаў ствараюцца вобразныя ўяўленні аб гістарычным мінулым.

Новыя магчымасці для прымянення прынцыпу нагляднасці адкрываюць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Аналіз вопыту выкладання гістарычнай прапедэўтыкі ў школах паказвае, што найбольш шырокае распаўсюджванне атрымала прымяненне мультымедыйных прэзентацый. Мультымедыйная прэзентацыя – гэта праграмны прадукт, які ўтрымлівае тэкставыя матэрыялы, фотаздымкі, малюнкі, слайд-шоў, гукавое і дыктарскае суправаджэнне, відэафрагменты і анімацыю, трохмерную графіку [4, с. 12]. Мультымедыйная вучэбная прэзентацыя па гісторыі прадастаўляе магчымасць спалучаць лагічны і вобразны спосабы засваення інфармацыі, актывізаваць навучанне за кошт узмацнення нагляднасці, павысіць матывацыю навучання, садзейнічае эмацыянальнаму ўспрыманню інфармацыі, фарміруе ў навучэнцаў уменне авалодваць рознымі формамі самастойнай дзейнасці па апрацоўцы інфармацыі. Мультымедыйная прэзентацыя, якая адна-

часова задзейнічае графічную, тэкставую и аўдыёвізуальную інфармацыю, аб'яднаную ў адну структуру, дазваляе ўключыць усе органы пачуццяў пры ўспрыманні падзей гісторыі і рэчаіснасці, данесці да навучэнцаў гістарычную інфармацыю ў максімальна нагляднай і лёгка ўспрымаемай форме.

Мультымедыйная прэзентацыя для ўрока «Мая Радзіма – Беларусь» павінна быць накіравана на развіццё трох кампанентаў гістарычных уяўленняў:

– кагнітыўнага, які фарміруецца ў працэсе вучэбнай и пазаўрочнай дзейнасці і характарызуецца сістэмай ведаў па гісторыі сваёй краіны;

– эмацыянальна-вобразнага, які адлюстроўвае непасрэдныя перажыванні, адчуванні прыемнага и непрыемнага; адносіны да свету, людзей, працэсу і выніку ўласнай дзейнасці; прадугледжвае эмацыянальна-вобразнае канструяванне зместу паняцця аб прадмеце яшчэ да таго, як яно сфарміруецца;

– каштоўнасна-матывацыйнага, які адлюстроўвае духоўны пачатак, закладзены ў гісторыі роднай краіны і здольны стаць здабыткам асобы навучэнца, ствараe накіраванасць на вывучэнне гісторыі.

На ўроках «Мая Радзіма – Беларусь» у адпаведнасці са зместам вучэбнага праграмнага матэрыялу мэтазгодна выкарыстоўваць мультымедыйныя прэзентацыі аб гістарычных асобах (асветнікі – Е. Полацкая, К. Тураўскі, Ф. Скарына, С. Будны; княжна Рагнеда, князі У. Чарадзей і Вітаўт, канцлер Л. Сапега і інш.), аб падзеях беларускай гісторыі. Для навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту найбольш цікавымі і даступнымі з'яўляюцца веды аб родным краі, горадзе, вёсцы, якія даюць ім магчымасць адчуць дачыненне сваёй сям'і і асобы да гісторыі краіны, выхоўваюць любоў і павагу да роднай зямлі і яе герояў. Таму ў склад прэзентацыі трэба ўключаць краязнаўчы матэрыял. Напрыклад, у прэзентацыю «У што верылі нашы продкі» – матэрыял аб мясцовых культавых помніках; «Будаўніцтва новага жыцця» – аб буйных прадпрыемствах свайго регіёну; «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны» – аб земляках – удзельніках барацьбы з фашысцкімі акупантамі і г.д.

У навукова-метадычнай літаратуры адсутнічае сістэмны аналіз праблемы выкарыстання мультымедыйных прэзентацый пры вывучэнні гістарычнай прапедэўтыкі, што на практыцы прыводзіць да метадычных памылак, самай распаўсюджанай з якіх з'яўляецца пераўтварэнне іх у простую ілюстрацыю вучэбнага материалу. Трэба памятаць, што дзеці малодшага школьнага ўзросту не могуць самастойна арганізаваць працэс сістэматычнага назірання, таму для стварэння ў іх гістарычных уяўленняў неабходна ставіць перад імі вучэбную задачу [5, с. 47]. Вучэбныя заданні да мультымедыйных прэзентацый павінны забяспечваць дасягненне мэтаў урока: адукацыйнай (стварэнне ў навучэнцаў гістарычных вобразаў і фарміраванне паняццяў); развіваючай (развіццё пазнавальнай цікавасці, інтэлектуальных уменняў

і творчых здольнасцяў); выхаваўчай (выхаванне грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы) [6, с. 29].

Мультымедыйная прэзентацыя, якая прызначана для ўрокаў гістарычнай прапедэўтыкі, павінна адпавядаць наступным дыдактычным патрабаванням: дакладнае вызначэнне мэты яе прымянення ў вучэбна-выхаваўчым працэсе; вызначэнне этапаў урока, на якіх яна будзе выкарыстоўвацца; узгодненасць з іншымі навучальнымі сродкамі на ўроку; улік зместу вучэбнага матэрыялу; адпаведнасць матэрыялу прэзентацыі ўзросту навучэнцаў. Пры гэтых умовах мультымедыйная прэзентацыя становіцца эфектыўным сродкам стварэння ў малодшых школьнікаў гістарычных уяўленняў, развіцця наглядна-вобразнага мыслення і эмацыянальнай сферы, садзейнічае рашэнню адукацыйных, выхаваўчых і развіваючых задач урока. На выніковасць прымянення мультымедыйных прэзентацый уплывае таксама захаванне тэхнічных і тэхналагічных патрабаванняў да іх.

Такім чынам, актуальнай з’яўляецца праблема стварэння спецыялістамі (метадыстамі сумесна з вучонымі-гісторыкамі, мастакамі-афарміцелямі, праграмістамі) вучэбных мультымедыйных прэзентацый па гісторыі Беларусі для пачатковай школы, якія б з’яўляліся спецыяльным метадычным, навукова абгрунтаваным прадуктам для арганізацыі вучэбнага працэсу на аснове сучасных інфармацыйных тэхналогій.

**Спіс літаратуры**


1. Студеникин, М. Т. Методика преподавания истории в школе / М. Т. Студеникин. – М. : Владос, 2000. – 240 с.
2. Учебные программы для учреждений среднего образования с русским языком обучения. I–IV классы. – Минск : НИО, 2012. – 239 с.
3. Маклаков, А. Г. Общая психология / А. Г. Маклаков. – СПб. : Питер, 2017. – 582 с.
4. Информационные технологии в образовании / авт.-сост. О. А. Минич. – Минск : Красико-Принт, 2008. – 176 с.
5. Божович, Л. И. Проблемы формирования личности: избр. психол. тр. / Л. И. Божович; под ред. Д. И. Фельдштейна. – М. : МПСИ; Воронеж : МОДЭК, 2001. – 349 с.
6. Методыка выкладання прадмета «Мая Радзіма Беларусь» / аўт.-склад. Л. В. Яршова. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2008. – 72 с.